УДК 323.113:796(476)

**В. У. Коваль**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ФАРМІРАВАННЕ САКАЛІНАГА РУХУ БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯСПАРЫ Ў 1920-Я ГГ.

Артыкул прысвечаны гісторыі стварэння спартыўна-гімнастычнага руху ў асяроддзі беларусаў замежжа. Асаблівая ўвага ў даследаванні надаецца пытанням псіхалагічнай і фізічнай адаптацыі беларускіх эмігрантаў да гімнастычнай сістэмы, якая патрабавала ад кожнага студэнта высокага ўзроўню дысцыплінаванасці і арганізаванасці. Першая суполка «Беларускі Сокал» была заснавана ў Празе ў 1923 г. Першапачатковa заснавальнікамі арганізацыі сталі 14 студэнтаў, аднак колькасць членаў «Беларускага Сокала» хутка павялічылася. Кандыдатам у члены арганізацыі чыталі курс лекцый пра маральнае і фізічнае выхаванне ў перыяд выпрабавальнага тэрміну. Ініцыятыву развіцця спартыўнага руху ў Чэхаславакіі падтрымалі беларускія настаўнікі ў Латвіі і Літве, якія спрабавалі развіваць ідэю гімнастычнай сістэмы для выхавання вучнёўскай моладзі. Саюз моладзі «Беларускі Сокал» спрыяў працэсу кансалідацыі нацыянальнай дыяспары, развіваў актыўныя міжнародныя кантакты, папулярызаваў дзейнасць беларускай грамады ў розных краінах свету, дапамагаў беларускім студэнтам рэалізаваць свой фізічны і асобасны патэнцыял. Беларускія студэнты ў Чэхаславакіі прымалі ўдзел у канцэртах і вечарынах, якія рэгулярна праводзіліся ў Сакаліным Народным доме ў Празе. Прыкладам міжнароднага супрацоўніцтва беларускай гімнастычнай арганізацыі стаў удзел студэнтаў у святе жаночага аддзела «Чэшскага Сокала» ў 1924 г. Інфармацыя пра навіны гімнастычнага таварыства рэгулярна публікавалася на старонках часопіса «Беларускі студэнт», які рыхтаваўся да друку ў Празе.

**Ключавыя словы**: беларуская дыяспара, сакаліны рух, Чэхаславакія, спартыўны рух, гімнастычная сістэма, псіхалагічная адаптацыя, міжнароднае супрацоўніцтва.

**Для цытавання**: Коваль В. У. Фарміраванне сакалінага руху беларускай дыяспары ў 1920-я гг. // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2024. № 1 (281). С. 34–37.
DOI: 10.52065/2520-6885-2024-281-6.

**V. U. Koval**
Belarusian State Technological University

# FORMATION OF THE FALCON MOVEMENT OF THE BELARUSIAN DIASPORA IN THE 1920S

The article explores the history of the formation of the sports and gymnastics movement among Belarusians abroad. Particular attention was paid to the issues of psychological and physical adaptation of the Belarusian emigrants to the gymnastics system, which requires a high level of discipline and organization from each participant. The first organization “Belarusian Falcon” was founded in Prague in 1923. The founders of the organization were 14 students, but the number of members of “Belarusian Falcon” quickly increased. Candidate members of the organization were given a course of lectures on moral and physical education during the probationary period. The initiative to develop the sports movement in Czechoslovakia was supported by Belarusian teachers in Latvia and Lithuania. The teaching staff tried to use the idea of a gymnastics system for the education of Belarusian schoolchildren. The youth union “Belarusian Falcon” contributed to the process of consolidation of the national diaspora, expanded international contacts, and popularized the activities of Belarusians in different countries, helped develop the physical and personal potential of the Belarusian students. Belarusian students in Czechoslovakia took part in concerts and performances that were regularly held at the Falcon People’s House in Prague. The example of international cooperation of the Belarusian gymnastics organization was the participation in the celebration of women’s department of “Czech Falcon” in 1924. Information about the news of the gymnastics society was regularly published on the pages of the magazine “Belarusian Student”, which was published in Prague.

**Keywords**: Belarusian diaspora, Falcon Movement, Czechoslovakia, sports movement, gymnastics system, psychological adaptation, international cooperation.

**For citation**: Koval V. U. Formation of the Falcon Movement of the Belarusian diaspora in the 1920s. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2024, no. 1 (281), pp. 34–37 (In Belarusian).
DOI: 10.52065/2520-6885-2024-281-6.

**Уводзіны.** Гісторыя фарміравання беларускай дыяспары ў міжваенны перыяд – гэта не толькі эканамічныя і палітычныя аспекты, але і пытанні культурнага, грамадскага, спартыўнага жыцця беларусаў замежжа. Фарміраванне сакалінага гімнастычнага руху ў асяроддзі беларускай моладзі дэманструе шырокае супрацоўніцтва нацыянальнай дыяспары з іншымі народамі і арганізацыямі. Міжнароднае спартыўна-гімнастычнае таварыства спрыяла ўключэнню беларускіх грамадскіх арганізацый у дзейнасць студэнцкага руху. Беларускія эмігранты ўдзельнічалі ў спартыўных спаборніцтвах і культурных вечарынах, што спрыяла іх кансалідацыі і працэсу сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі за мяжой.

**Асноўная частка.** Найбуйнейшым цэнтрам беларускага спартыўна-гімнастычнага сакалінага руху стала Чэхаславакія. Гісторыя стварэння ўнікальнай фізкультурна-гімнастычнай сістэмы ў Празе пачалася ў 1862 г. са з'яўлення гімнастычнага таварыства пад назвай «Пражскі Сокал», галоўным арганізатарам якога стаў доктар філалогіі Міраслаў Тырш [1, с. 170]. Некаторыя эмігранты ведалі пра сакаліную спартыўную сістэму, бо яна стала папулярнай у пачатку XX ст.

Ініцыятыўная група беларусаў у Празе стварыла гімнастычнае аб'яднанне 27 лютага 1923 г., перашачаткова яно налічвала толькі 14 чалавек, аднак колькасць суполкі хутка павялічвалася [2, арк. 35]. Друкаваным органам арганізацыі фактычна стаў часопіс «Беларускі студэнт», які рыхтаваўся да друку ў Празе і падрабязна апісваў навіны арганізацыі ў спецыяльных рубрыках пад назвай «Сакаліны аддзел» і «Сакаліная пошта».

Гімнастычная сістэма патрабавала ад кожнага чалавека рэгулярнасці трэніровак, таму заняткі праводзіліся тры разы на тыдзень (у панядзелак, сераду і пятніцу) [2, арк. 35 зв.]. Для ўдасканалення спартыўна-гімнастычнай сістэмы былі распрацаваны меры псіхалагічнай і фізічнай адаптацыі. Першыя заняткі ў спартыўнай зале часта станавіліся стрэсам для асобы, таму ў інструкцыях падкрэслівалася: «З пачатку Вам будзе здавацца, што ўсе ў гімнастычнай залі на Вас глядзяць – што ўсе над Вамі сьмяюцца, але і на гэта не зварочвайце ўвагі – бо усе пачынаючыя гэта адчуваюць – а запраўды гэтага нічога няма. Пасьля першых дзён будзеце хадзіць як разламаныя – усё цела будзе балець – так што можа некаторым будзе здавацца, што ён нядатны да гімнастыкі – але гэта бывае спачатку з усімі з прычыны фізолёгічных і шкоды ад гэтага няма ніякае» [2, арк. 35 зв.]. Халоднае і вільготнае надвор'е, недахоп грошай для харчавання спрыялі распаўсюджванню хваробы на сухоты ў асяроддзі студэнцкай моладзі, пра што неаднаразова ўздымала пытанне арганізацыя «Чырвоны Крыж». Сакаліная гімнастыка шмат для каго з членаў арганізацыі з'яўлялася эфектыўнай прафілактыкай і магчымасцю захаваць здароўе ва ўмовах эміграцыі.

Члены арганізацыі лічылі, што ўважлівымі прычынамі пропускаў гімнастычных заняткаў маглі быць толькі акадэмічныя запазычанасці ці хвароба. У выпадку адсутнасці на трэніроўках член арганізацыі павінен быў пісаць заяву, каб яго не выключылі з суполкі. Прыкладам такога дакумента з'яўляецца заява студэнта Буські ад 19.10.1923: «Даважу даведама Прэзыдыум здружэньня "Беларускі Сокол", што я ня магу хадзіць у Сокал таму, што ёсьць хвост» [3]. Беларуская гімнастычная арганізацыя ўжо ў 1923 г. сфарміравала актыў сваіх членаў, які ў выхаваўчых мэтах падтрымліваў дысцыпліну ў арганізацыі. Міжнародныя гімнастычныя спаборніцтвы ў Празе стваралі дадатковую матывацыю для рэгулярных трэніровак членаў «Беларускага Сокала».

Як і патрабавала заканадаўства прымаючага грамадства, беларуская сакаліная суполка атрымала афіцыйную рэгістрацыю ў Чэхаславакіі. У 1923 г. быў зацверджаны Статут арганізацыі, якая мела па дакументах афіцыйную назву – Саюз моладзі «Беларускі Сокал» у г. Прага [4]. Удзельнікамі гімнастычнай суполкі маглі стаць хлопцы ці дзяўчыны не маладзейшыя за 18 гадоў [4]. Членамі арганізацыі былі беларускія студэнты не толькі з Прагі, але і беларусы з іншых гарадоў Чэхаславакіі, некаторыя маладыя людзі жылі за 20–30 км ад чэшскай сталіцы, але рэгулярна наведвалі трэніроўкі. Згодна са Статутам, у арганізацыі выбіраўся стараста, намеснік, скарбнік, пісар, бібліятэкар, суполка стварыла суд гонару і рэвізійную камісію. Фарміраванне фондаў бібліятэкі лічылася важным кірункам працы кожнай нацыянальнай структуры сакалінага руху. Як адзначае вядомы спецыяліст ў галіне эмігрантазнаўства А. Джус, фарміраванне кнігазбораў, дзейнасць нацыянальных курсаў і гурткоў спрыяла прафесійнаму станаўленню асобы пры навучанні за мяжой [5, с. 27]. Сакаліныя суполкі мэтанакіравана прапагандавалі спорт і гімнастыку, яны мянялі лад жыцця сваіх членаў, бо паспяховай адаптацыяй да спорту вызначаліся ў першую чаргу асобы з імкненнем да самаўдасканальвання.

Зарэгістраваныя ў Чэхаславакіі арганізацыі з ліку замежных грамадзян павінны былі ў сваім Статуце абавязкова запісаць пункт аб непалітычнай дзейнасці струткуры. Статут для рэгістрацыі суполкі неабходна было падрыхтаваць толькі на чэшскай мове. «Беларускі Сокал» вытрымаў усе пратрабаванні ў сваёй дакументацыі для арганізацый эмігрантаў у Чэхаславакіі. Статут нацыянальнай гімнастычнай арганізацыі Чэхаславакіі захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва.

Сакаліны рух быў не толькі спартыўнай арганізацыяй, кожны яе член павінен быў прайсці спецыяльны ідэалагічны курс у перыяд выпрабавальнага тэрміну (6 месяцаў перад урачыстым прыёмам у арганізацыю). Лекцыі сакалінай школы былі прысвечаны пытанням арганізацыі гімнастычнага руху, разглядаліся асноўныя мэты і ідэі аб'яднання, закраналіся аспекты маральнага і фізічнага выхавання асобы на аснове гімнастычнай сістэмы, вывучалася гісторыя гімнастыкі і яе рэгіянальныя адметнасці [6, с. 31]. Кандыдаты ў члены арганізацыі, якія паспяхова справіліся з навучаннем у сакалінай школе, дапускаліся да ўрачыстай прысягі. Асобныя суполкі нацыянальных арганізацый міжнароднага сакалінага руху называліся «гнёзды». Адметнасцю беларускіх «сакаліных гнёздаў» у Чэхаславакіі стала тое, што там асноўны кантынгент складаўся са студэнцкай моладзі.

Аналагічны статут на чэшскай мове арганізацыі «Украінскі Сокал» захоўваецца ў Архіве горада Прагі. У дакуменце ўкраінскай сакалінай арганізацыі падкрэслівалася ідэя пра супрацоўніцтва са згуртаваннямі іншых славянскіх народаў у Чэхаславакіі [7]. Ліставанне «Беларускага Сокала» пацвярджае актыўныя кантакты з украінскай дыяспарай. Фарміраванне ўкраінскіх суполак у Чэхаславакіі пачалося з 1922 г. у Падэбрадах, аднак паступова «сакаліныя гнёзды» распачалі сваю працу таксама ў Празе і іншых гарадах [8, с. 271]. У Беларускім дзяржаўным архівемузеі літаратуры і мастацтва захоўваюцца афіцыйныя звароты да ўкраінскай супольнасці Прагі, ліставанне з Украінскім акадэмічным хорам.

Сакаліны рух у Чэхаславакіі вылучаўся сваёй актыўнасцю, што тлумачыцца значнай колькасцю студэнцкай моладзі, якая імкнулася праявіць свае здольнасці ў грамадскіх аб'яднаннях. Сакаліныя арганізацыі розных славянскіх народаў праводзілі ў Празе свае нацыянальныя вечарыны, арганізоўвалі дэманстрацыю сваіх народных касцюмаў, займаліся падрыхтоўкай адукацыйных курсаў. Адметнасцю сакаліных суполак ад іншых грамадскіх арганізацый моладзі стала актыўнае правядзенне спартыўных спаборніцтваў і гульняў.

Прыкладам паспяховага міжнароднага супрацоўніцтва «Беларускага Сокала» быў удзел беларускіх студэнтаў у свяце жаночага аддзела «Чэшскага Сокала», прысвечаным 25-м угодкам Віна-градскага гуртка. На ўрачыстасці выступіла член «Беларускага Сокала» Ганна Ліхадзеяўшчанка, пра што была апублікавана інфармацыя ў часопісе «Беларускі студэнт»: «Гэтак памалу – дробнымі крокамі наш сакол будзе знаёміць Чэскае грамадзянства з існаваньнем Беларусі і яе жыцьцём і гэтай працы хопіць у нас пакуль мы заграніцай – вонках бацькаўшчыны» [9, с. 31]. Супрацоўніцтва паміж чэшскімі і беларускімі членамі міжнароднага гімнастычнага руху дэманструе той факт, што «Беларускі Сокал» імкнуўся папулярызаваць дасягненні нацыянальнай арганізацыі, таму ўдзел у чэшскім жаночым свяце разглядаўся беларускімі студэнтамі як магчымасць фарміравання міжнародных кантактаў.

Сакаліны рух у міжваенны перыяд з'яўляўся альтэрнатывай для скаўцкіх арганізацый. Канкурэнцыя паміж сакольствам і скаўцкімі арганізацыямі прадэманстравана ў афіцыйным лісце дырэктара Люцынскай беларускай гімназіі (Латвія) да Камітэта гуртка «Беларускі Сокал» у Празе: «Хоць у мяне і пабудавана ўжо арганізацыя скаутаў, але я залажу і сакольскі гурток. Дужа прашу зараж-жа выслаць мне усе, што тольк і знойдзецца у любой славянскай мове па сакольству: настаўленьня, статуты, справаздачы, часопісі, альбомы, асобныя фатаграфіі, апісаньня формы і упражненьняў, каманды, прывітаньня, адказы і інш» [10, арк. 14]. Просьбы адміністрацый беларускіх гімназій з Латвіі не засталіся без адказу. Сакаліная суполка ў Чэхаславакіі нават спрабавала атрымаць стыпендыі для навучання інструктараў у Празе з ліку беларускіх настаўнікаў у Латвіі, пра што пазначалася ў часопісе «Беларускі студэнт» [11, с. 31]. Беларусы ў Чэхаславакіі дзяліліся сваім вопытам фарміравання гуртка з нацыянальнымі арганізацыямі ў іншых краінах свету, давалі парады па працэдуры склікання ўстаноўчага сходу, апісвалі афармленне і камплектацыю памяшкання для трэніровак. Асаблівую цікавасць вучнёўскай і студэнцкай моладзі выклікала форма членаў сакалінага руху, традыцыі і звычкі спартыўна-гімнастычнага таварыства. Сімвалам арганізацыі была птушка сокал, эмблему якой актыўна выкарыстоўвалі члены міжнароднага таварыства.

Ліставанне «Беларускага Сокала» ў Празе з арганізацыямі Літвы пацвярджае факт аб спробах фарміравання сакалінага гуртка ў Коўна пад назвай «Крывіч» [10, акр. 23]. Беларусы Чэхаславакіі з мэтай пашырэння спартыўнага руху даслалі ў Літву прыклад свайго статута, часопісы з артыкуламі пра сакольства, кнігі і іншыя друкаваныя матэрыялы. Беларускія настаўнікі ў Літве намагаліся пашырыць спартыўна-гімнастычную сістэму сярод беларускіх школьнікаў.

Традыцыі міжнароднай сакалінай арганізацыі вымушалі беларусаў адпавядаць міжнародным стандартам. Па прыкладзе іншых славянскіх арганізацый ў Празе «Беларускі Сокал» 16 сакавіка 1924 г. правёў вечарыну ў гонар гадавіны стварэння сваёй суполкі ў Чэхаславакіі [10, арк. 61]. Урачыстасць праводзілася ў Сакаліным Народным доме ў Празе, дзе размяшчалася галоўная арганізацыя міжнароднага руху.

**Заключэнне.** Такім чынам, асноўны цэнтр беларускага спартыўна-гімнастычнага руху аформіўся ў

Чэхаславакіі, аднак намеры стварэння гурткоў былі таксама ў Латвіі і Літве, дзе выкладчыкі спрабавалі сфарміраваць сакаліныя суполкі для выхавання вучнёўскай моладзі. «Беларускі Сокал» у Празе ў 1920-я гг. актыўна папулярызаваў спартыўна-гімнастычную сістэму сярод беларусаў замежжа, гурток таксама супрацоўнічаў з чэшскімі дабрачыннымі арганізацыямі і ўкраінскімі культурнымі суполкамі. Спартыўна-гімнастычная сістэма сакалінага руху спрыяла самаўдасканальванню студэнтаў, фарміравала арганізаванасць і дысцыплінаванасць, дапамагала беларускай моладзі рэалізаваць свой фізічны і асобасны патэнцыял, спрыяла пашырэнню сацыяльных кантактаў у прымаючым грамадстве.

## Спіс літаратуры

1. Качулина Н. Н. Исторические условия возникновения и развития сокольского физкультурно-гимнастического движения в Чехии и других славянских странах в конце XIX – первой четверти XX вв. // Символ науки. 2017. № 5. С. 167–172.

2. БДАМЛМ (Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва). Ф. 3. Воп. 1. Спр. 49. Акр. 35–36.

3. БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 178. Арк. 22.

4. БДАМЛМ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 174. Арк. 6.

5. Джус О. В. Професійне становлення і виховання молоді у програмах українських студентських організацій держав Заходу (1900–1930-ті гг.) // Педагогічні науки. 2019. Вип. LXXXVI. С. 22–28.

6. Сакольская школа // Беларускі студэнт. 1924. № 7. С. 31.

7. Archiv hlavniho města Prahy (Архіў горада Прагі). Fond Solkový katastr. Sign.: XIII/0233. Svaz ukrajinského sokolstva za hranicemi.

8. Наріжний С. Українська еміграція. Культурна праця української еміграції між двома світовими війнами. Львів; Кент; Острог: Наукове товариство ім. Шевченка, 2008. 482 с.

9. Аб выступленьні беларускага Сакала на сьвяце жаноцкага аддзелу Чэскага Вінаградскага Сакала // Беларускі студэнт. 1924. № 7. С. 31.

10. БДАМЛМ, Ф. 3. Воп. 1. Спр. 176. Арк. 14–61.

11. Грам. N у Дзьвінску // Беларускі студэнт. 1924. № 7. С. 31.

## References

1. Kachulina N. N. Historical conditions for the emergence and development of the Falcon physical culture and gymnastics movement in the Czech Republic and other Slavic countries at the end of the 19th – first quarter of the 20th centuries. *Symvol nauki* [Symbol of science], 2017, no. 5, pp. 167–172 (In Russian).

2. BSAMLA (Belarusian State Archive and Museum of Literature and Art). Fund 3. I. 1. F. 49. L. 35–36.

3. BSAMLA. Fund 3. I. 1. F. 178. L. 22.

4. BSAMLA. Fund 3. I. 1. F. 174. L. 6.

5. Dzhus O. The professional development and upbrining of youth in the programs of Ukrainian student organizations of the West states (1900s–1930s). Pedagogichni nauki [Pedagogical sciences], 2019, vol. LXXXVI, pp. 22–28 (In Ukrainian).

6. Falcon school. *Belaruski student* [The Belarusian Student], 1924, no. 7, p. 31 (In Belarusian).

7. Prague City Archives. Fund Federal inventory. F. XIII/0233. Union of the Ukrainian Falcon organization abroad.

8. Narizhny S. *Ukrayinska emigratsiya. Kul'turna pratsya ukrayinskoyi emigratsiyi mizh dvoma svitovimi viynami* [Ukrainian emigration. Cultural activity of the Ukrainian emigration between two World wars]. Lviv; Kent; Ostrog, Naukove tovaristvo im. Shevchenka Publ., 2008. 482 p (In Ukrainian).

9. About the performance of the Belarusian falcon at the festival of the female department of the Vinograd Czech Falcon. *Belaruski student* [The Belarusian Student], 1924, no. 7, p. 31 (In Belarusian).

10. BSAMLA. Fund 3. I. 1. F. 176. L. 14–61.

11. Mr. N. in Dvinsk. *Belaruski student* [The Belarusian Student], 1924, no. 7, p. 31 (In Belarusian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Коваль Вольга Уладзіміраўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: koval@belstu.by

## Information about the author

**Koval Volha Uladzimirauna** – PhD (History), Associate Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: koval@belstu.by

*Паступіў 14.03.2024*